# КНІГА ПРАРОКА НАВУМА

1 Прароцтва пра Нінэвію; кніга ўяваў Навума
Элкасэяніна.
2 Гасподзь ёсьць Бог руплівец і помсьнік; помсьнік
Гасподзь і страшны ў гневе: помсьнік Гасподзь
ворагам Сваім, і ня зьлітуецца з супраціўцаў Сваіх.
3 Гасподзь шматцярплівы і вялікі магутнасьцю і не
пакідае без пакараньня; у віхуры і ў буры шэсьце
Госпада, воблака - пыл ад ног Ягоных.
4 Загадае Ён мору - і яно высыхае, і ўсе рэкі
перасыхаюць; вяне Васан і Карміл, і блякне квет на
Ліване.
5 Горы трасуцца перад Ім, і пагоркі растаюць, і зямля
хістаецца перад абліччам Ягоным, і сусьвет і ўсе, што
жывуць на ёй.
6 Перад абурэньнем Яго хто ўстоіць? І хто сьцерпіць
полымя гневу Яго? Гнеў Яго разьліваецца як агонь;
скалы распадаюцца перад Ім.
7 Добры Гасподзь, - прыстанак у дзень скрухі - і ведае
тых, што на Яго спадзяюцца,
8 але ўсепатопным паваднкам разбурыць дашчэнту
Нінэвію, і ворагаў Яго спасьцігне морак.
9 Што намышляеце вы супроць Госпада? Ён учыніць
зьнішчэньне, і бедства ўжо не паўторыцца,
10 бо пераплеценыя паміж сабою, як цярноўнік і
ўпітыя, як п'яніцы, яны пажэртыя будуць начыста, як
сухая салома.
11 Зь цябе павёўся той, хто намысьліў ліхое супроць
Госпада, хто склаў змову бязбожную.
12 Так кажа Гасподзь: хоць яны бясьпечныя і
шматлікія, але яны будуць пасечаны і зьнікнуць;

а цябе, хоць Я абцяжарваў, больш абцяжарваць ня буду.
13 І сёньня Я скрышу ярмо ягонае, якое ляжыць на
табе, і путы твае парву.
14 А пра цябе, Асур, Гасподзь вызначыў: ня будзе
болей насеньня з тваім імем; з дома бога твайго
зьнішчу балваноў і куміраў, падрыхтую табе ў ім
магілу, бо ты будзеш у пагардзе.
15 Вось, на горах - ступакі дабравесьніка, які абвяшчае
мір: сьвяткуй, Юдэя, сьвяты твае, выконвай твае
абяцаньні, бо ня будзе болей праходзіць па табе
бязбожнік: ён зусім зьнішчаны.

# Нав 2

1 Падымаецца на цябе разбуральнік: ахоўвай
цьвярдыні, ахоўвай дарогу, умацуй сьцёгны, зьбірай
сілу.
2 Бо адновіць Гасподзь веліч Якава, як веліч Ізраіля, бо
спустошылі іх спусташальнікі і вінаградныя галіны іх
вынішчылі.
3 Шчыт герояў ягоных прыгожы; воіны яго ў адзеньні
барвовым; агнём блішчаць калясьніцы ў дзень
падрыхтоўкі да бою, і лес дзідаў хвалюецца.
4 Па вуліцах нясуцца калясьніцы, грымяць на
плошчах; бляск ад іх, як ад агню; бліскаюць, як
маланкі.
5 Ён выклікае адважных сваіх, але яны спатыкаюцца
на хаду сваім; сьпяшаюцца на муры горада, але аблога
наладжана ўжо.
6 Рачная брама адчыняецца, а палац разбураецца.
7 Вырашана: яна будзе аголена і зьведзена ў палон,
і рабыні яе будуць стагнаць, як галубы, б'ючы сябе ў
грудзі.

8 Нінэвія з часу свайго існаваньня была як сажалка,
запоўненая вадою, а яны бягуць. «Стойце, стойце!»
Але ніхто не азіраецца.
9 Рабуйце срэбра, рабуйце золата! няма канца
запасам усякага каштоўнага начыньня.
10 Разрабавана, спустошана і сплюжана яна, - і растае
сэрца, калені трасуцца; ва ўсіх сьцёгнах моцны боль,
і твары ва ўсіх пацямнелі.
11 Дзе цяпер логвішча ільвоў і тая паша для ільвянят,
па якой хадзіў леў, ільвіца і львяня, і ніхто не палохаў
іх,
12 леў, які хапае для насычэньня шчанюкоў сваіх і
душыць для ільвіц сваіх, і напаўняе здабычаю пячоры
свае і логвішчы свае - схопленым?
13 Вось Я - на цябе! кажа Гасподзь Саваоф. І спалю ў
дыме калясьніцы твае, і меч зжарэ ільвянят тваіх, і
зьнішчу зь зямлі здабычу тваю, і ня будзе болей чуцен
голас паслоў тваіх.

# Нав 3

1 Гора гораду крыві! увесь ён поўны падману і
забойства; ня спыняецца ў ім рабунак.
2 Чутно, як ляскае біч і стукаюць, круцяцца колы, іржэ
конь і грукоча на скаку калясьніца.
3 Імчыцца коньніца, бліскае меч і бліскаць дзіды;
забітых мноства і груды трупаў: няма канца трупам,
спатыкаюцца аб трупы іх.
4 Гэта - за многія блудадзействы распусьніцы
прыемнай зьнешнасьці, спрактыкаванай у
чарадзействе, якая блудадзействамі сваімі прадае
народы і чарадзействамі сваімі - плямёны.
5 Вось Я - на цябе! кажа Гасподзь Саваоф. І падыму
на аблічча твае краі вопраткі тваёй, і пакажу народам
галізну тваю і царствам сарамату тваю.

6 І закідаю цябе мярзотамі, зраблю цябе пагарджанаю
і выстаўлю цябе на паглум.
7 І будзе тое, што ўсякі, убачыўшы цябе, пабяжыць ад
цябе і скажа: «спустошана Нінэвія! Хто пашкадуе яе?
дзе знайду я суцешнікаў табе?»
8 Хіба ты лепшы за Но-Амона, які ляжыць паміж
рэкамі, акружаны вадою, валам якога было мора, і
мора служыла сьцяною яму?
9 Эфіопія і Егіпет зь безьлічным мноствам іншых
служылі яму падмацаваньнем; Копты і Лівійцы
прыходзілі на дапамогу табе.
10 Але і ён пераселены, пайшоў у палон; нават
немаўляты яго перабітыя на скрыжаваньнях усіх
вуліц, а на знакамітых яго кідалі жэрабя, і ўсе
вяльможы яго скаваны ланцугамі.
11 Так і ты - сп'янееш і зьнікнеш; так і ты будзеш
шукаць абароны ад няпрыяцеля.
12 Усе ўмацаваньні твае падобныя на смакоўніцу
са сьпелымі пладамі: калі страсянуць іх, дык яны
ўпадуць проста ў рот таму, хто хоча есьці.
13 Вось, і народ твой - як жанчыны ў цябе: ворагам
тваім разнасьцежацца брамы зямлі тваёй, агонь
зжарэ замкі твае.
14 Начэрпай вады на час аблогі; мацуй крэпасьці твае;
ідзі ў бруд, тапчы гліну, папраў печ для абпалу цэглы.
15 Там зжарэ цябе агонь, пасячэ цябе меч, паесьць
цябе, як вусень, хоць бы ты і памножыўся, як вусень,
памножыўся, як саранча.
16 Купцоў у цябе стала больш, чым зорак на небе; але
гэтая саранча расьсеецца і паляціць.
17 Князі твае - як саранча, і ваеначальнікі твае - як
раі мошак, якія ў час холаду гняздуюцца ў шчылінах
сьцен, і калі ўстане сонца, дык разьлятаюцца, - і не
пазнаеш месца, дзе яны былі.

18 Сьпяць пастары твае, цар Асірыйскі, пакояцца вяльможы твае; народ твой расьсеяўся па горах, і няма каму сабраць яго.
19 Няма лекаваньня ране тваёй, хваравітая пошасьць твая. Усе, хто пачуў вестку пра цябе, будуць пляскаць у далоні за цябе, бо на каго не пашыралася бесьперастанку злосьць твая?

# Біблія (пераклад В.Сёмухі)
# The Holy Bible in Belarusan
## Белорусское Новый Завет и Притчи

copyright © 2016 John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

Language: Belarusian

Translation by: Antoni Bokun

Contributor: John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

This translation is made available to you under the terms of the Creative Commons Attribution-No Derivatives license 4.0.
You may share, redistribute, or adapt this Bible translation or extracts from it in any format, provided that:

You include the above copyright and source information.

You do not use this work for commercial purposes.

Pictures included with Scriptures and other documents on this site are licensed just for use with those Scriptures and documents. For other uses, please contact the respective copyright owners.

2019-12-29

---

PDF generated using Haiola and XeLaTeX on 11 Nov 2022 from source files dated 29 Jan 2022
5bafea06-5eb3-574c-9054-5e4b38c21bbc